# ПРАМОВА тав. НАТАЛЕВІЧА

**(В. а. старшыні ЦВК БССР)**

Таварышы! У сваім дакладзе тав. Волкаў ускрыў перад XVII з'ездам Камуністычнай партыі большэвікоў Беларусі асноўныя недахопы ў рабоце ЦК і яго апарата, недахопы ў рабоце партыйных арганізацый Беларусі.

КП(б)Б пад кіраўніцтвам Сталінскага Цэнтральнага Камітэта, пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна правяла велізарную работу па ачышчэнню партыйных радоў ад ворагаў народа, трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх бандытаў. Прароблена значная работа па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы і на культурным фронце.

У выніку разгрому ворагаў, КП(б)Б прарабіла велізарную работу ў справе вылучэння на кіруючую партыйную, савецкую і гаспадарчую работу маладых, здольных кадраў, бязмежна адданых вялікай справе Леніна—Сталіна.

Аднак у рабоце партарганізацый ёсць многа недахопаў, аб якіх гаварыў тав. Волкаў у сваім справаздачным дакладзе. Задачай XVII партыйнага з'езда з'яўляецца ўскрыць усе недахопы, каб дапамагчы Цэнтральнаму Камітэту пабольшэвіцку іх ліквідаваць, не дапусціўшы іх паўтарэння.

Рэспубліка адстае з выкананнем важнейшых дзяржаўных абавязацельстваў — мясапаставак, малакапаставак, фінансавага плана. Так, план па мясапастаўках, уключаючы нядоімкі 1937 года, выканан толькі на 87 проц., па калгаснаму сектару—на 75 проц. і па аднаасобнаму—на 28 проц. Абавязак усіх партыйных арганізацый заключаецца ў тым, каб мабілізаваць усе сілы на бастрэйшае выкананне дзяржаўных абавязацельстваў.

Небывала вырасла палітычная актыўнасць працоўных мас. Увесь савецкі народ 12 снежня 1937 года галасаваў за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных. У гэтых умовах пытанні арганізацыйнага кіраўніцтва набываюць рашаючае значэнне ў справе забеспячэння поспеху на любым участку партыйнай, савецкай і гаспадарчай работы.

На жаль, пытанням арганізацыйнай работы вельмі мала аддаюць увагі партыйныя арганізацыі. У сувязі з гэтым у практычнай рабоце часам выпускаецца галоўнае, нашы таварышы бяруцца за адну справу, упускаюць другую.

Я хачу завастрыць увагу з'езда на арганізацыйна-масавай рабоце советаў. Гэта мае рашаючае значэнне для забеспячэння выканання ўсіх палітычна-гаспадарчых мерапрыемстваў. Партыйная праслойка ў калгасах і сельсоветах яшчэ вельмі слабая. Так, у 22 раёнах Магілеўскай вобласці ў калгасах ёсць толькі тры пярвічных партарганізацыі. Комсамольская праслойка таксама нізкая.

Значыць партыйныя арганізацыі павінны абапірацца на савецка-калгасны актыў. Секцыі, дэпутацкія групы — гэта вялікая армія савецкага актыва, які пад кіраўніцтвам партарганізацыі можа забяспечыць выкананне рашэнняў партыі і ўрада.

Аднак, гэтых актыў на месцах не ўважаюць. У Аршанскім горсовеце налічваецца 100 дэпутатаў і ні адзін з іх не прыцягнут да актыўнай работы. Такое-ж становішча і з членамі райвыканкомаў, не гаворачы ўжо аб нізавым сельсовецкім актыве. Пленумы савецкіх арганізацый склікаюцца ад выпадка да выпадка, галоўным чынам урачыстыя.

Вядома, ў гэтым вялікая віна ЦВК, які абмяжоўваўся толькі заслухоўваннем справаздач старшынь райвыканкомаў, даваў указанні, выносіў пастановы, але не аказваў практычнай дапамогі совецкім арганізацыям у ажыццяўленні рашэнняў партыі і ўрада.

Наша рэспубліка знаходзіцца напярэдадні выбараў у Вярхоўны Совет БССР. Беларускі народ перажывае дні ўсенароднага лікавання, радасці і урачыстасці па поваду дачы згоды вялікага Сталіна і яго бліжэйшых саратнікаў балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Сталінскі Цэнтральны Камітэт аказаў нам вялікае давер'е. Гэта патрабуе ад партыйных і непартыйных большэвікоў Беларусі дастойна сустрэць і па-большэвіцку правесці выбары ў Вярхоўны Совет рэспублікі.

Таварышы, трэба з усёй рашучасцю адзначыць, што падрыхтоўка да выбараў у многіх раёнах праходзіць не толькі нездавальняюча, але яўна нецярпіма. Так, на 1 чэрвеня у Дрыбінскім раёне арганізавана толькі 96 гурткоў па вывучэнню выбарчага закона і Сталінскай Канстытуцыі і ахоплена 2.982 чалавекі выбаршчыкаў. У Чавускім раёне з 32 тысяч выбаршчыкаў ахоплена агітацыяй 19 тысяч. У Клічаўскім раёне ахоплена гурткамі толькі 30 проц. выбаршчыкаў. Ахоп працоўных прапагандай па рэспубліцы вельмі нізкі, раўняецца прыблізна 50—60 проц.

Горсаветы, райвыканкомы, сельсаветы павінны былі ўлічыць усе недахопы мінулай выбарчай кампаніі з тым, каб іх зараз не паўтараць. Гомельскі горсовет у мінулай выбарчай кампаніі пры складанні спісаў выбаршчыкаў прапускаў цэлыя кварталы. Аднак і зараз ён паўтарае гэтыя памылкі. Па Набярэжнай вуліцы было прапушчана 20 дамоў. Гэтыя памылкі паўтараюцца і ў іншых гарадах і раёнах рэспублікі. Спісы выбаршчыкаў — гэты важнейшы дзяржаўны дакумент — складаюцца ў некаторых раёнах вельмі дрэнна. Часта ўносяцца папраўкі старшынямі ўчастковых выбарчых камісій. Такім чынам парушаюцца патрабаванні выбарчага закона.

Чым растлумачыць дрэнную падрыхтоўку да выбараў. Першая прычына — гэта самасупакоенне з боку вельмі многіх кіраўнікоў, якія разважалі, што выбары ў Вярхоўны Совет СССР праведзены добра, ёсць вопыт і таму няма чаго спяшацца з падрыхтоўкай да выбараў. Слаба кіруюць гэтай работай партыйныя і совецкія арганізацыі. Вельмі часта ў многіх раёнах і гарадах перакладаецца ўся адказнасць за падрыхтоўку да выбараў на плечы выбарчых камісій.

І апошняе пытанне — гэта рэагаванне на скаргі працоўных. Вельмі многа заяў ад рабочых, калгаснікаў і служачых паступае ў нашы цэнтральныя ўстановы. Дастаткова прывесці такую лічбу, што за 1937 год у прыёмную ЦВК паступала 25.161 скарга. За 1938 год у прыёмную ЦВК паступалі 8.300 скарг, па трох наркаматах—Наркамфіну, Наркамзему і Наркамасветы — 9.518. Днямі на прэзідыуме ЦВК заслухоўвалі Вярхоўны суд аб стане рэагавання на скаргі. На 1 красавіка ў гэтай установе скапілася 3 тыс. скарг. Вярхоўны суд заклікан змагацца за рэволюцыйную законнасць, змагацца супроць бюракратызма чыноўнікаў, пэганіны, але ён сам недапушчальна адносіцца да пісем працоўных.